# ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ ПРАКТИКУМ «СУБЪЕКТИВНАЯ КАРТИНА ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ САМОРЕАЛИЗАЦИИ»

## Повышение уровня профессиональной компетентности учителей в ходе реализации инновационного проекта



**О. А. Гудень,**
заместитель директора по учебно-методической работе гимназии г. Щучина

**Выработка учителем персональной стратегии педагогической деятельности осуществляется в процессе профессиональной самореализации. При этом формирование у педагога профессиональных компетенций происходит на основе самопознания, самоактуализации, самоидентификации, самопроектирования, саморазвития и саморегуляции [1]. Данные положения легли в основу инновационного проекта «Внедрение модели развития готовности педагога к профессиональной самореализации в интегрированном образовательно-профессиональном пространстве» (консультант – ректор Гродненского областного института развития образования С. А. Сергейко), в реализации которого участвует коллектив нашей гимназии.**

В рамках проекта нами разработан **практикум для педагогов «Субъективная картина профессиональной самореализации»**, в ходе которого у участников появляется возможность изучить разнообразие тактик профессиональной самореализации в педагогической деятельности и специфику каждой из них, на основе результатов самодиагностики составить четкое представление о себе как о педагоге (определить для себя образ «Я-педагог»). Программа практикума составлялась прежде всего с учетом интересов тех членов коллектива, которые рассматривают профессиональную самореализацию как одну из важнейших социальных и личностных ценностей и мотивированы на ее осуществление, нацелены на выстраивание индивидуальной траектории развития на основе собственных интересов и выбора направлений самообразования, форм контроля, включения в различные виды профессиональной активности.

**Цель** практикума «Субъективная картина профессиональной самореализации» – овладение педагогами практическими умениями и навыками построения своего профессионального Я, включающего готовность успешно реализовать личный потенциал в профессиональной деятельности (готовность к профессиональной самореализации) путем самоорганизации, формального, информального образования и самообразования, самовоспитания и саморазвития.

**Задачи:**
- повысить уровень компетенций педагогов в вопросах профессиональной самореализации;
- создать условия для апробирования участниками психолого-педагогических методик, предназначенных для проведения самодиагностики;
- расширить знания учителей в области анализа, моделирования и конструирования индивидуальной образовательной траектории профессиональной самореализации.

Все занятия практикума построены по единому принципу и содержат педагогические ситуации, задачи, упражнения, тесты, фрагменты уроков и другие практические материалы.

*Первая и заключительная части каждого занятия* – рефлексия (от 5 до 10 минут), при этом в начале предлагается упражнение на создание атмосферы заинтересованности и сотрудничества, в завершении – на осознание значимости проделанной работы.

*Вторая часть занятия* – теоретическая (до 20 минут). Сначала участники прослушивают мини-лекцию (не более 10 минут), в ходе которой ведущий разъясняет цель занятия, теоретико-методические основания рассматриваемой темы (информация подкрепляется слайдами презентации). Далее в течение 10 минут педагоги в группах

изучают и обсуждают научный текст с целью освоения основных понятий.

*Третья часть занятия* – дискуссия (более 2 часов), которая начинается с разминки. Затем ведущий организует обсуждение материала и практическую (диагностическую) работу, нацеленную на анализ и разрешение поставленных задач, применение полученных знаний.

Приведем пример одного из занятий практикума **по теме «Самореализационный портрет педагога»**, рассчитанного на 4 часа. К концу занятия педагоги должны:

- усвоить материал о тактиках профессиональной самореализации педагога и соответствующих им самореализационных портретах;
- составить профессиограммы различных самореализационных портретов педагогов;
- овладеть способами развития творческого потенциала личности в соответствии с определенным самореализационным портретом.

**Ход занятия**

**I. Организационно-мотивационный этап**

**Прием «Ромашка».** Каждый участник записывает на одном из лепестков ромашки ответы на следующие вопросы: «Без чего я не был бы педагогом?», «Что мне особенно дорого, ценно и важно в моей профессии?»

**II. Операционно-познавательный этап**

**Мини-лекция.** Ведущий знакомит участников с задачами занятия, акцентирует их внимание на особенностях профессиональной самореализации (ПС) личности и тактиках ПС педагога.

Все учителя произвольно делятся на группы по 5–6 человек.

**Групповая дискуссия.** Участникам предлагается перечислить слагаемые профессиональной самореализации педагога. На доске совместно составляется формула: *профессиональная самореализация педагога* = ...+...+....

Каждый учитель получает для изучения текст «Портреты профессиональной самореализации педагога» (см. журнал «Народная асвета» за 2022 г., № 9, с. 3–6), организуется обсуждение, в ходе которого выявляются особенности 11 тактик ПС и соответствующих им самореализационных портретов.

**Работа в группах.** На основе изученного текста создаются модели самореализационных портретов педагогов (каждая группа выбирает свой), результаты деятельности комментируются.

**Работа в парах.** Каждая пара участников создает видеоролик «Такие разные учителя» о педагоге, которому соответствует определенный самореализационный портрет. Ролики демонстрируются, организуется обсуждение.

**Индивидуальная работа, тестирование.** Каждый педагог проводит самодиагностику с помощью комплекса методик, предложенных консультантом инновационного проекта.

**Прием «Карта личности».** На основе полученных результатов самодиагностики участники рисуют карты личности.

**Прием «Письмо в будущее».** Учителям предлагается написать себе письма, представив, что они живут в 2030 году. Содержание письма: что педагог думает о себе как профессионале, что его интересует, что он хочет себе пожелать.

**Прием «Мой путь в профессии».** Ведущий напоминает сюжет из народных сказок про Ивана Царевича, стоящего на перекрестке дорог и определяющего, по какому пути идти дальше, а затем просит педагогов порассуждать: «Представьте себя на месте этого путника. О чем вы думаете? Что вы чувствуете? По какому пути хотите пойти?» Участники рисуют на листе бумаги прошлое, настоящее и варианты будущего в профессии: к чему они хотят прийти, какую тактику ПС выбрать, что возьмут с собой в дорогу, с чем встретятся на пути, чему предстоит научиться.

**Прием «Эссе».** Ведущий предлагает учителям обсудить следующие цитаты: «Познай самого себя, и ты познаешь Вселенную и богов» (Сократ), «Познав себя, ни один человек не останется тем, кем был» (Т. Манн), «Кто не изучил человека в самом себе, никогда не достигнет глубокого знания людей» (Н. Г. Чернышевский). Затем каждый участник пишет эссе, в котором раскрывает свои положительные и отрицательные качества как профессионала, перспективы профессионального развития, тактику собственной ПС.

**Прием «Объявление».** Педагоги индивидуально готовят объявление презентационного характера в газету «Я – самый классный учитель. Ищу работу».

**III. Подведение итогов. Рефлексия**

**Групповая дискуссия.** Ведущий просит учителей порассуждать, что каждый из них ищет в профессии и как этого достичь.

**Открытый микрофон «Самореализационный портрет педагога».** В свободной форме каждый участник высказывает свое мнение на заданную тему (какой я педагог и каким хочу быть в будущем, к каким выводам я пришел в результате сравнения, какая тактика мне наиболее интересна и представляет для меня ценность и др.).

**Рефлексия «Цепочка пожеланий».** Педагоги по цепочке обращаются с пожеланиями к себе и к коллегам по итогам взаимодействия.

## ЛИТЕРАТУРА


1. **Сергейко, С. А.** Готовность педагога к профессиональной самореализации: сущность и структура / С. А. Сергейко // Адукацыя і выхаванне. – 2022. – № 2. – С. 37–45.
2. **Сергейко, С. А.** Профессиональная самореализация молодого педагога: монография / С. А. Сергейко. – Гродно: Гродненский областной институт развития образования, 2017. – 196 с.
3. **Сергейко, С. А.** Самореализация личности педагога: составляющие успеха: учебное пособие / С. А. Сергейко. – Гродно: Гродненский областной институт развития образования, 2019. – 160 с.

# УРОК ДЛЯ ДАРОСЛЫХ «МАСТАЦТВА ЗАДАВАЦЬ ПЫТАННІ»

## Рэалізацыя пратакола «Тыпы пытанняў» у рамках тэхналогіі «Даследаванне ў дзеянні»



**Л. М. Казлова,**
намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце
СШ № 18 г. Пінска



**І. М. Сінюціч,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
СШ № 18 г. Пінска

**Метадычная работа – важнае звяно сістэмы бесперапыннай адукацыі педагога: без пастаяннага ўдасканалення прафесійных кампетэнцый праца настаўніка немагчыма. Важна адзначыць, што рэсурсам прафесійнага развіцця педагогаў можа стаць вопыт калег, аднак, на жаль, гэты рэсурс выкарыстоўваецца недастаткова. Задача метадычнай службы ўстановы адукацыі – стварыць магчымасці для эфектыўнага прафесійнага ўзаемадзеяння.**

**Адным са сродкаў арганізацыі прафесійнага абмену вопытам паміж настаўнікамі, развіцця ў іх прадметна-метадычных кампетэнцый з'яўляецца тэхналогія «Даследаванне ў дзеянні», дакладней яе элемент – куратарская методыка. Мы выкарыстоўваем гэту тэхналогію ў межах рэалізацыі рэспубліканскага інавацыйнага праекта «Укараненне мадэлі развіцця прадметна-метадычных кампетэнцый педагогаў ва ўмовах абнаўлення зместу адукацыі на аснове тэхналогіі «Даследаванне ў дзеянні» (куратарская методыка)» (кансультант – А. У. Радзевіч).**

Куратарская методыка заснавана на арганізацыі работы педагогаў у пары. Настаўнікі назіраюць за ўрокамі адзін аднаго, аднак не па звыклай мадэлі «аб усім» – на кожны ўрок у пары ёсць канкрэтнае заданне куратара і адзін аспект для аналізу; астатнія нюансы ўрока не разглядаюцца. Педагогі абмяркоўваюць не свае суб'ектыўныя адчуванні, а рэальныя паказчыкі эфектыўнасці заняткаў.

Важнай фігурай выступае «разумны трэці» – куратар, які арганізуе работу двух настаўнікаў, забяспечвае іх псіхалагічны камфорт, утрымлівае прафесійны дыялог у канструктыўным рэчышчы.

Для рэалізацыі аднаго з правіл куратарскай методыкі («Чатыры чвэрці – чатыры паляпшэнні») у нашай школе былі вызначаны аспекты пратаколаў (алгарытмаў) назіранняў на навучальны год: «Час на роздум», «Размеркаванне ўвагі», «Тыпы пытанняў», «Выказванне пахвалы».

Для таго каб настаўнік мог спраектаваць урок па вызначаным аспекце (тыпе пратакола), мы

праводзім ***урокі для дарослых***. Гэта форма метадычнай работы прадугледжвае актыўную пазнавальную дзейнасць не толькі педагога, які прадстаўляе свой вопыт, але і іншых удзельнікаў. Метадычныя прыёмы адпрацоўваюцца настаўнікамі, якія выступаюць у ролі вучняў, у працэсе азнаямлення з новым матэрыялам.

Прапанаваны ўрок для дарослых разлічаны на 18 чалавек, падзеленых на 3 групы. Дзяленне адбываецца па колеры бэйджа (сіні – настаўнікі-назіральнікі, чырвоны – дзяўчынкі-навучэнкі, зялёны – хлопчыкі-навучэнцы). Настаўнікі-назіральнікі вядуць пратакол «Тыпы пытанняў» (Дадатак). Вядучы выконвае ролю куратара. На ўроку выкарыстоўваюцца элементы стратэгіі актыўнай ацэнкі (пастаноўка мэт на мове вучняў, работа з сігнальнымі карткамі: чырвоны – «разумею, справіўся з заданнем», зялёны – «не разумею, не справіўся з заданнем».

**Тэма.** Мастацтва задаваць пытанні.

**Мэта ўрока для дарослых:** стварэнне ўмоў для засваення педагогамі спосабаў і прыёмаў ужывання пытанняў розных тыпаў у межах рэалізацыі пратакола назірання «Тыпы пытанняў» па тэхналогіі «Даследаванне ў дзеянні».

**Абсталяванне:** вучэбны дапаможнік (Валочка Г. М. Беларуская мова, 6 клас, 2020), прэзентацыя, інтэрактыўнае заданне, сігнальныя карткі, ілюстрацыі да фразеалагізмаў, карткі з заданнямі, малюнкі для кросэнса.

**Ход урока для дарослых**

**I. Уступная гутарка**

**Вядучы.** Як добра, калі ў чалавека ёсць мара! Аб чым вы марыце? Як з'явілася ваша мара? Чым дапамагае чалавеку мара? (*Адказы ўдзельнікаў.*)

Дзякуй вам за гутарку! Мне было вельмі лёгка размаўляць з вамі. Як вы думаеце, чаму вы захацелі ўступіць у размову? Што дапамагло вам у гутарцы?

*Вядучы арганізуе дыялог з удзельнікамі, падводзячы іх да высновы, што правільна сфармуляваныя пытанні дазваляюць весці цікавую прадуктыўную размову.*

**II. Уводзіны ў тэму**

**Вядучы.** Імануіл Кант быў упэўнены, што граматна ставіць пытанні здольныя толькі разумныя людзі: «Бессэнсоўнае пытанне патрабуе бессэнсоўнага адказу». Правільна сфармуляванае пытанне прымусіць вучня добра падумаць і даць адказ. Для вядзення канструктыўнага вучэбнага дыялогу педагог павінен валодаць мастацтвам задаваць пытанні.

Пытанні бываюць двух тыпаў: прадуктыўныя і рэпрадуктыўныя.

❑ **Прыём «Інтуітыўны выбар»**

<u>Заданне.</u> Вашай увазе прапануецца спіс слоў і фраз, з якіх могуць пачынацца пытанні: *хто? У чым сэнс? Што? Як вы думаеце, што будзе, калі...? Дзе? У чым прычыны? Куды? Якія? Якія шляхі выхаду?* Ваша задача – размеркаваць іх па групах і запоўніць табліцу.

*Адказ*

| Прадуктыўныя пытанні | Рэпрадуктыўныя пытанні |
|---|---|
| У чым сэнс?<br>Як вы думаеце, што будзе, калі...?<br>У чым прычыны?<br>Якія шляхі выхаду? | Хто?<br>Што?<br>Дзе?<br>Куды?<br>Якія? |

**Вядучы.** Рэпрадуктыўныя пытанні не прадугледжваюць разважанняў вучня, а дапамагаюць толькі праверыць яго памяць. Прадуктыўныя пытанні – гэта пытанні, гатовых адказаў на якія няма, і вучань павінен дайсці да іх самастойна. Прадуктыўныя пытанні задаюцца ў іншай стылістыцы.

*Пытанні на аналіз:* у чым прычыны? Якія наступствы? Што паслужыла штуршком да падзей?

*Пытанні на абагульненне:* якія вынікі? Які вывад можна зрабіць? Якая ваша агульная ацэнка?

*Праектныя пытанні:* што можна было б зрабіць? Якія ёсць шляхі выхаду?

*Пытанні на прагназаванне:* як вы думаеце, што будзе, калі...?

*Пытанні на вызначэнне сутнасці:* што складае аснову? У чым сэнс сітуацыі? Якая галоўная ідэя (думка)?

*Пытанні на абгрунтаванне пазіцыі, ідэі:* чаму вы лічыце, што...? Чым вы можаце даказаць?

❑ **Прыём «Трансфармацыя»**

<u>Заданне.</u> Запішыце некалькі рэпрадуктыўных пытанняў у межах вашага вучэбнага прадмета і трансфармуйце іх у прадуктыўныя. (*Абмеркаванне вынікаў.*)

**III. Міні-ўрок**

**Вядучы.** Уявіце, што вы – навучэнцы 6 класа. Зараз у нас пройдзе ўрок беларускай мовы па тэме «Зваротны займеннік *сябе*». Педагогі-назіральнікі вядуць пратакол «Тыпы пытанняў».

**Ход урока**

***1. Арыентацыйна-матывацыйны этап***

Перад вамі некалькі прыказак.

1. Які Рыгорка, такая пра *яго* і гаворка.
2. У *яго* восем свят на тыдні.

3. Складна кумачкі пяюць, ды *ім* веры не даюць.

4. Хваліўся баравік шапкай, ды галавы пад *ёй* няма.

5. Галава не толькі для таго, каб на *ёй* шапку насіць.

6. Не рабі каму бяды, бо сам *яе* сустрэнеш.

Як вы думаеце, якую з гэтых прыказак можна ўзяць з сабой на ўрок? Чаму? (*Адказы ўдзельнікаў.*)

***2. Вызначэнне тэмы і мэты ўрока***

*Прыём «Літарны дыктант»*

З назваў аб'ектаў, прадстаўленых на малюнках, выпішыце літары, нумар якіх пазначаны, і вы даведаецеся, якая тэма нашага ўрока.




Наш стары знаёмы, Займеннік, зноў стане героем урока. Чаму тэма ўрока гучыць «Зваротны займеннік», а не «Зваротныя займеннікі»? (*Гэта адзіны займеннік, які складае цэлы разрад паводле значэння.*)

*Прыём «Запоўні плямы»*

Як вы думаеце, якія мэты нашай работы на ўроку? Запішыце прапушчаныя словы:

- ✓ **даведаемся,** які займеннік з'яўляецца ... (зваротным), якім членам у сказе з'яўляецца;
- ✓ **навучымся** ставіць займеннік у патрэбную ... (форму), знаходзіць яго ў ... (сказах), ... (ужываць) зваротны займеннік у маўленні.

На працягу ўрока сачыце за новым матэрыялам. Як толькі вы атрымаеце інфармацыю аб прапушчаным слове, падкрэсліце яго зялёным алоўкам. У канцы ўрока звернемся да нашых мэт.

***3. Аперацыйна-пазнавальны этап***

*Прыём «Назіраем і аналізуем»*

На дошцы запісаны сказы (зваротны займеннік выдзелены):

1. Мы не шукаем для **сябе** ^Р.скл.^ лёгкіх шляхоў.
2. Я пакінуў **сабе** ^Д.скл.^ самыя неабходныя рэчы.

<u>Пытанні</u>

- ✓ Чаму ў адным сказе – форма *сябе*, а ў другім – *сабе*?
- ✓ У якім склоне ўжыты зваротны займеннік у першым сказе? У другім?
- ✓ Якая форма зваротнага займенніка ў родным склоне? А якая ў давальным?

*Работа з апорнай табліцай*

Звярніце ўвагу на асаблівасці скланення займенніка. (*Аналізуецца напісанне форм слова.*)

| Склон | Форма займенніка *сябе* |
|---|---|
| Н. | - |
| Р. | сябе |
| Д. | сабе |
| В. | сябе |
| Т. | сабой (сабою) |
| М. | (аб) сабе |

Выканайце сінтаксічны разбор прапанаваных сказаў. Якім членам сказа з'яўляецца зваротны займеннік *сябе*? (*Дапаўненнем.*)

*Работа ў групах «Адпачні з фразеалагізмамі»*

Займеннік *сябе* можа ўваходзіць у склад фразеалагізмаў. Якое спалучэнне слоў называецца фразеалагізмам? (*Устойлівае непадзельнае спалучэнне, якое мае цэласнае значэнне.*)

<u>Заданне.</u> Успомніце фразеалагізм, у склад якога ўваходзіць зваротны займеннік *сябе*; растлумачце сэнс фразеалагізма (падказкі на картках: група 1 – малюнкі 1, 2, 3; група 2 – малюнкі 4, 5, 6).



| Фразеалагізм | Значэнне |
|---|---|
| рваць на сабе валасы | вельмі моцна перажываць |
| узяць сябе ў рукі | супакойваючыся, стаць больш сабраным, валявым |
| зарубіць сабе на носе | цвёрда запомніць |
| спаліць за сабою масты | рашуча парваць з мінулым, не мець магчымасці вярнуцца да яго |
| увайсці ў сябе | стаць замкнутым, негаваркім |
| як не ў сябе | багата, ненасытна есці, піць |

***4. Этап замацавання ведаў***

*Работа з тэкстам*

Наша здароўе

Здароўе даражэйшае за золата. Чалавек не можа яго купіць <u>сабе</u> [Д.скл.]. Таму з ранняга дзяцінства ён павінен клапаціцца аб сваім здароўі. А яно залежыць значна больш ад нашых звычак, харчавання, ладу жыцця, чым ад стану медыцыны.

Мы павінны любіць <u>сябе</u> [В.скл.], думаць <u>аб сабе</u> [М.скл.], займацца <u>сабою</u> [Т.скл.], сачыць за сваім здароўем. Гэта дасць нам магчымасць жыць поўным жыццём і адчуваць <u>сябе</u> [В.скл.] шчаслівымі.

<u>Пытанні і заданні</u>

- ✓ Да якога стылю і тыпу адносіцца тэкст? Чаму вы так лічыце?
- ✓ Сфармулюйце яго тэму.
- ✓ Вызначце асноўную думку.
- ✓ Як вы думаеце, што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку?
- ✓ Выпішыце сказы, у якіх ёсць зваротны займеннік, вызначце яго склон (*праца ў парах*).

***5. Кантрольна-ацэначны этап***

*Прыём «Кросэнс»*

А зараз мы вызначым самага ўважлівага. Вам неабходна здагадацца, што агульнага ў гэтых малюнках. (*Прыказкі.*)




Як вы лічыце, пры дапамозе якіх прыказак вы змаглі выканаць заданне? *(Корань навукі горкі, ды плады яго салодкія. Добра таго вучыць, хто хоча ўсё ведаць.)* Чаму вы выбралі менавіта гэтыя прыказкі? (*Адказы ўдзельнікаў.*)

*Індывідуальная работа*

<u>Заданне.</u> Спішыце прыказкі, устаўце замест пропуску зваротны займеннік у патрэбнай форме. Вызначце яго склон. (*Узаемаправерка работ па ключы; прыём «Святлафор»: правільна – зялёная картка, няправільна – чырвоная.*)

*Варыянт 1*

Ніхто сам **сабе (Д. скл.)** не вораг.

Хто шануе **сябе (В. скл.)**, таго і людзі шануюць.

Чаго не хочаш **сабе (Д. скл.)** самому, таго не чыні нікому другому.

*Варыянт 2*

Сам **сябе (В. скл.)** не хвалі, няхай людзі пахваляць.

Той шчасце мае, хто **сябе (В. скл.)** у руках трымае.

Хто позна ходзіць, сам **сабе (Д. скл.)** шкодзіць.

*Інтэрактыўная гульня*

На месцы пропуску ўстаўце займеннік **сябе** або **сабе**.

Паглядзі ... *на сябе*, трэба паважаць ... *сябе*, пакінь ... *сабе* толькі неабходнае, звярнуў ... *на сябе* ўвагу прысутных, нашкодзіў самому ... *сабе*, пакінуць ... *сабе* на памяць, паклапаціўся ... *пра сябе*, я купіў ... *сабе* марожанае.

***6. Рэфлексія***

Давайце звернемся да мэт, пастаўленых у пачатку ўрока, і прааналізуем, ці дасягнулі мы іх. (*Адказы ўдзельнікаў.*)

*Прыём «Закончы фразу»*

Выкажыце свае адносіны да ўрока, выкарыстоўваючы зваротны займеннік.

- ✓ Я вызначыў для сябе ...
- ✓ Я задаволены сабой...
- ✓ Я вазьму з сабой...

**IV. Аналіз пратакола «Тыпы пытанняў»**

Арганізуецца гутарка з педагогамі-назіральнікамі, якія на працягу ўрока запаўнялі пратакол «Тыпы пытанняў», і аналіз пратаколаў.

<u>Пытанні да ўсіх удзельнікаў</u>

- ✓ Ці будуць адрознівацца колькасныя суадносіны пытанняў розных тыпаў у малодшых і старшых класах? Чаму?
- ✓ Што трэба рабіць, каб прадуктыўныя пытанні заўсёды былі «пад рукой»?
- ✓ Якія пытанні настаўнік задае часцей?

- ✓ Якія тыпы пытанняў настаўнік задае моцным, сярэднім, слабым вучням?
- ✓ Ці мяняюцца паводзіны вучняў, калі ім задаюць больш складаныя пытанні? Чаму і як мяняюцца?
- ✓ Як састаўляць прадуктыўныя пытанні для тых вучняў, якім прадмет даецца цяжка?
- ✓ Ці можна навучыць дзяцей задаваць прадуктыўныя пытанні?

## Дадатак

**Заданне для назіральніка**

*(крыніца: www.direktoria.academy)*

***Перад урокам***

- ✓ Надрукуйце табліцу для назірання.
- ✓ Вазьміце на ўрок тэлефон з функцыяй гуказапісу або дыктафон.

***На ўроку***

- ✓ Старайцеся запісваць усе пытанні, якія настаўнік задае вучням (можаце ўключыць дыктафон на час апытвання).
- ✓ Вызначыце для кожнага пытання яго тып: рэпрадуктыўнае (Р) або прадуктыўнае (П).

***Пасля ўрока***

- ✓ Калі вы сумняваецеся, якога тыпу было тое ці іншае пытанне, удакладніце пасля ўрока ў настаўніка.
- ✓ Падлічыце колькасць пытанняў розных тыпаў.

***Пратакол назірання (базавы)***

| | | | |
|---|---|---|---|
| Настаўнік | | | |
| Назіральнік | | | |
| Куратар | | | |
| Дата правядзення ўрока | | | |
| Дата абмеркавання (не пазней, чым праз 48 гадзін пасля правядзення) | | | |
| Колькасць вучняў на ўроку | | | |
| Колькасць пытанняў настаўніка | | | |
| Колькасць вучняў, якія адказвалі | | | |
| Колькасць рэпрадуктыўных пытанняў (доля) | | | |
| Колькасць прадуктыўных пытанняў (доля) | | | |
| Заўвагі і ідэі | | | |

## ЛІТАРАТУРА


1. **Глинский, А. А.** Управление системой методической работы в общеобразовательном учреждении / А. А. Глинский. – Минск: Зорны верасень, 2008. – 248 с.
2. **Дадли, П.** Lesson Study: теория и практика применения [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://figym.kz/uploads/LS_tpp.pdf. – Дата доступа: 18.12.2021.
3. **Куксо, Е. Н.** Миссия выполнима: как повысить качество образования в школе / Е. Н. Куксо. – М.: Сентябрь, 2016. – 192 с.
4. **Загвязинский, В. И.** Исследовательская деятельность педагога / В. И. Загвязинский. – М.: Академия, 2006. – 132 с.




**Л. В. Тарасенко,**
методист высшей категории управления организационно-методического сопровождения и ресурсного обеспечения МГОИРО

## «УЧИТЕЛЬ ГОДА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ»: СЦЕНАРИЙ СУПЕРФИНАЛА РАЙОННОГО ЭТАПА КОНКУРСА

Республиканский конкурс профессионального мастерства педагогических работников «Учитель года Республики Беларусь» – значимое событие в сфере образования нашей страны, которое объединяет инициативных, креативных, энергичных, целеустремленных педагогов и способствует повышению профессиональной компетентности, распространению инновационного опыта, внедрению эффективных образовательных технологий.

В ходе мероприятий учителя презентуют эффективный методический опыт, решают нестандартные педагогические задачи, проводят открытые уроки в незнакомом классе (группе), соревнуются в искусстве публичных выступлений. Ярким, запоминающимся моментом для участников районного (городского) этапа конкурса может стать суперфинал (сценарий представлен на сайте журнала www.n-asveta.by).